# ДУХОЎНА-ФІЛАСОФСКАЯ КАНЦЭПТУАЛЬНАСЦЬ ПАЭЗІІ ГАЛІНЫ ТВАРАНОВІЧ

**А. С. Кавалюк**

*Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна, б-р Касманаўтаў, 21, 224016, г. Брэст, Рэспубліка Беларусь, box@brsu.by*

У артыкуле асэнсоўваецца духоўна-філасофская паэзія Галіны Тварановіч, прапаведніцы ідэі Богацэнтрызму, не вельмі ўласцівай светапогляду сучаснага чалавека.

***Ключавыя словы:*** духоўная паэзія; лірычная гераіня; душа; малітва; існасць.

# ДУХОВНО-ФИЛОСОФСКАЯ КОНЦЕПТУАЛЬНОСТЬ ПОЭЗИИ ГАЛИНЫ ТВАРАНОВИЧ

**А. С. Ковалюк**

*Брестский государственный университет имени А. С. Пушкина, б-р Космонавтов, 21,224016, Брест, Республика Беларусь, box@brsu.by*

В статье анализируется духовно-философская поэзия Галины Тваранович, проповедницы идеи богоцентризма, не слишком характерной для мировоззрения современного человека.

***Ключевые слова:*** духовная поэзия; лирическая героиня; душа; молитва; бытие.

# SPIRITUAL-PHILOSOPHICAL CONCEPTUALITY OF THE POETRY OF GALINA TVARANOVICH

**A. S. Kovalyuk**

*Brest State University named after A. S. Pushkin, 21 Kosmanautov Boulevard, 224016, Brest, Republic of Belarus, box@brsu.by*

The article analyzes the spiritual-philosophical poetry of Galina Tvaranovich, a preacher of the idea of God-centrism, which is not very characteristic of the worldview of modern man.

***Keywords:*** spiritual poetry; lyrical heroine; soul; prayer; being.

У сучаснай беларускай літаратуры грунтоўна прадстаўлена духоўная паэзія, дзякуючы творам Рыгора Барадуліна, Зніча, Ірыны Багдановіч, Таісы Бондар і інш. Сярод іх адметнае месца займае лірыка

Галіны Твараповіч, аўтаркі кніг “Ускраек тысячыгоддзя” (1996) і “Бурштынавы яблык” (2010). Сустрэчы з Галінай Паўлаўнай пакінулі самыя светлыя ўспаміны. Пра яе лепш не сказаш, чым уласнымі радкамі паэткі: “*Ёсць людзі, / у якіх уваходзіш, / быццам у Храмы… / Дзе льецца святло / і прарастае / увачавідкі / зямля ў Неба…*” [1, с. 72].

Галіна Тварановіч – творца своеасаблівага мыслення і ўспрымання свету. Цэнтрам светабудовы яна бачыць Неўміручага, Дасканалага і Таемнага Бога-Бацьку, “*воляй якога разгорнута / дзівосная мапа Сусвету / з горнім і дольнім паверхамі*”, нябеснае супрацьпастаўлена “*цяснінам чалавечага шляху*” [1, с. 98]. Лірычная гераіня спрабуе даўмецца, “*чаму / быццам бы і сагрэтая горнім, / самотная душа натужліва / шукае цяпельца дальняе. / Ды анёл ціха падказвае: / «Глянь, вунь твае горняе / б’ецца крыламі аб столь / цеснай чалавечай галубятні. / Цішэй шукай дзверы – / у сябе»*” [1, с. 53].

Углядаючыся “*ў глыб свае душы, / зашчэмленай жорнамі тугі*”, гераіня Галіны Тварановіч спазнала, што “*усё існае нараджаецца ў пакуце*” [1, с. 20] і пераканалася, што “*прадонне уласнай душы / шмат глыбей і страшней / за багну…*” [1, с. 56]. Яна задаецца пытаннямі: “*Якою мушу быць, / каб не здарожыцца раней часу / і не спазніцца на сустрэчу з сабой? / Што мушу рабіць, / каб спраўдзіць наканаванае ад веку, / ды не заблытаць свой лёс, / а Спатканнем шлях зямны завершыць?*” [1, с. 78]. Лірычная гераіня Галіны Тварановіч здольна тонка адчуваць трапяткі стан абуджэння “*гнятлівай тугой прыцярушанай*” душы, успрымае гэтае абуджэнне “*дарам жыццядайным*”, “*нараджэннем цуду*” [1, с. 18]. Яна нават прыкмячае, “*як аднекуль – / з глухіх глыбінь, ці зіхоткіх вышынь – / маё вечнае «я» вельмі выразна / пасміхаецца з таго майго «я», / што ўвасоблена, ці зняволена / у вярыгах слабое плоці, / няздольнай зычліва абараняцца / ад гнёту штодзённых варункаў – лагодным даверам вечнай / ЛЮБОВІ*” [1, с. 90].

Душа лірычнай гераіні увесь час у напружанай духоўнай працымаленні за сябе і іншых. Многія вершы Галіны Тварановіч – гэта прамы зварот да Бога з просьбай аб духоўнай падтрымцы, настаўленні на шлях праведны: “*Божа! / Насуперак спёкам, якія здрадай / маёю / Табе – / раскашуюцца, / навучы мяне быць удзячнаю. / Дай мне сілы на добрае. / І адымі, калі мыслю благое. / Ачысці крыніцы мае. / Хай бруяцца ў згодзе – / Вера, Надзея, Любоў*” [1, с. 8]; “*Хрысце, даруй нам, няверным, / нямоглым, / за бясконцасць пакуты Тваe…*” [1, с. 26]; “*О, Госпадзе, / Ісусе Хрысце! / Абарані Сябе Самога / У хадзе няўдзячнай нашай. / Спустошанай раллі / Не дай загінуць. / Веры ратавальнаю расой / Аддзяч няўдзячных, / Міласэрны Божа!*” [1, с. 84]. Гераіня перананана, што

“*самотны малітоўны дар трымае цвердзь нябёсаў*” [1, с. 95]. Таму і звяртаецца да абраных, “*чый сталы дах – нябёсы расхінутыя. / Чый светлы лёс – са Хрыстом сумоўе*” [1, с. 66], каб не пакідалі “*астуджаных / насуперак / спрадвечнаму каменню / пад нашай рукой*”. Гераіня спазнала сілу ўзаемнай малітвы, калі “*адчыняецца Неба насустрач / маленню пра сябра. / І старыцай вяртаецца ўласная сіла, / тады, як ужо не чакаеш падмогі, / а толькі плывеш / настойліва-ціха / шляхам / агульнай / пакуты. / І дбаеш аб тым, / каб / хапіла дыхання другому / уліцца у Вечнасць / і пазваць за сабою…*” [1, с. 76]

Лірычная гераіня Галіны Тварановіч адчувае ўсюдыісную прысутнасць Усявышняга: “*Маўчанне Госпада – / побач, / углядаецца ў абрысы мае душы*” [1, с. 9]. Яна разумее, што Господняю ласкай “*Богаслаславёная цішыня*” з Вечнасці прарастае, і наадварот, адышоўшыся ад Яго крыніцы, заблудзіўшыся, пачувае сябе “*вусцішна, сцюдзённа*” і, як паратунку просіць: “*Пазаві мяне, Божа!*” [1, с. 9]. Самакрытычна ўсведамляючы, што з дня ў дзень выпрабоўвае цярпенне Госпада, гераіня супрацьпастаўляе сябе, “*брыдкую кроплю нягеглае плоці*” міласэрнаму і доўгацярпліваму Пакутніку, што з Маці Прачыстай сваёй здольны ахінуць “*покрывам ціхамірнасці ўдзячнае, / каб мяне ад мяне ж / абараніць / і апраўдаць / перад Айцом Нябесным*” [1, с. 17]. Разумеючы супярэчлівасць сваёй існасці (“*пекла й рай, / дабро й зло, / цемра й святло – / усё гэта я…*”), яна ўспрымае сябе ражном, “*што папярок устае / Боскай святое задумы / аб чалавеку*” [1, с. 50]. Таму ў тузе і скрусе “*апрыклую душу*” зноў і зноў нясе ў Храм для пакаяльнага ачышчэння: “*слабізнаю жыццёваю, бы здрадай, вінюся прад Самім Жыццём*” [1, с. 150]. Лірычная гераіня ўсведамляе залежнасць слабой сваёй існасці ад Сілы Господняй і бачыць сэнс у “*гаючай сіле вяртання да Першакрыніцы – Хрыстова крыжа*” [1, с. 109], шчаслівая ад таго, што можа “*сабе дазволіць / уздыхаць і стагнаць – / даверлівае дзіця / ля ног / Бацькі-Бога*” [1, с. 140].

Жыццё ўспрымаецца ёю адказнай вандроўкай, у якой “*зведвае амаль што кожная душа / дзёрзкай завязі спакусу – / па ўладзе гордай смагу / ды прагу здрадлівую самасці*” [1, с. 24]. Гераіня Галіны Тварановіч пераконвае, што пераадольваюцца ўсе спакусы “*толькі літасцю Хрыста, / распятага за людскія грахі*” [1, с. 24]. Разважае яна і над праблемай замаху чалавека на дар жыцця, лічыць гэта “*прывідам кволай самастойнасці*”, чалавечай няўдзячнасцю, а абяздоленых і спакушаных самагубцаў успрымае “*ахвярамі шматаблічнай гардыні*” [1, с. 25]. Гэта пра іх, спакушаных ворагам роду чалавечага, напісана: “*шэпча вораг, / а побач – / смуткуе і плача / ХРЫСТОС*” [1, с. 133].

Хрысціянскія матывы ў вершах Галіны Тварановіч часам перакрыжоўваюцца з матывамі Айчыны: "*Ісус – / Айчына. / Горняй мары – / жальба і надзея. / У бясконцасць – / працяг жыцця*" [1, с. 13] або "*Апякуюць анёлы калыску / Бацькоўскіх надзей і трывог. / Вялікаснай міласцю / дбайна агледжаны / лапік Сусвету. / Хрыстовай крывёю асвенчаны / у зорную Існасць парог*" [1, с. 28].

Вобраз любай сэрцу Айчыны для лірычнай гераіні паяднаны з вобразамі маці, роднага Дараганава з яго верасамі, Багдановічавага васілька: "*На ільняным палетку / вышыванага мамай абруса / зіхацяць васількі. / Сціплыя – нябесныя – кветкі Айчыны маёй*" [1, с. 34]. Кветкі для лірычнай гераіні – дарунак Божы на зямлі.

Духоўна-філасофская канцэптуальнасць паэзіі Галіны Тварановіч выяўлена ў прапаведніцтве ідэі Богацэнтрызму, не вельмі ўласцівага светапогляду сучаснага чалавека. Лірычная гераіня яе вершаў адчувае ўсюдыісную прысутнасць Усявышняга. Многія творы паэткі – гэта прамы зварот да Бога з просьбай аб духоўным настаўленні. Гераіня ведае сілу малітвы за сябе і за іншых. Яна пастаянна ўглядаецца ў глыб свае душы, бярэ на сябе адказнасць за здзейсненае. Усведамляючы залежнасць слабой сваёй існасці ад Сілы Гасподняй, сэнс бачыць у вяртанні да гаючай Першакрыніцы. Галіна Тварановіч дэманструе чытачу ўласную адданасць Усявышняму, дае прыклад парадкавання душы, напаўнення яе духаносным.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Тварановіч Г. П.* Бурштынавы яблык. Беласток : Бібліятэка Беларускага літаратурнага аб'яднання "Белавежа", 2010.